


# РАДАСЦЬ І ВЯСЁЛЫ НАСТРОЙ

**У сталічным выдавецтве «Каўчэг» убачыла свет кніга нашай калегі па Саюзе пісьменнікаў Беларусі, дзіцячай пісьменніцы з Гродна Таццяны Сучковай. Новае выданне называецца «Сонечная карусель» і з'яўляецца вынікам перамогі Таццяны Аркадзьеўны з рукапісам кнігі ў IV абласным конкурсе рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч).**

Вось, што гаворыцца ў анатацыі да новай кнігі: «Кніга «Сонечная карусель» адвядзе чытачоў у краіну цудаў і чараўніцтва. Пазнаёміць з жывёламі, птушкамі і зачаруе прыродай роднага краю. Вясёлыя вершы, смяшынкі і пацешныя казкі, быццам сонечная карусель, падораць радасць і вясёлы настрой. З вялікім задавальненнем «Сонечная карусель» запрашае ўсіх у незабыўнае падарожжа». Выданне адрасуецца дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Кампазіцыйна змест кнігі складаецца з трох жанравых раздзелаў: «Вершы», «Смяшынкі» і «Казкі».

Першапачаткова, на стадыі аўтарскай задумы новая кніга Таццяны Аркадзьеўны Сучковай павінна была называцца «Вясёлкавы карагод», прынамсі такую назву меў рукапіс кнігі. А назвы твораў, якія ўвайшлі ў зборнік, не змяніліся: «Хто падарыў буслу чырвоныя боцікі?», «Як чайнік насвістаў гасцей», «Пра хамячка Харытона з Пшанічнага раёна» і іншыя. Не змянілася і творчая стратэгія пісьменніцы. Яна заключаецца ў тым, каб дарыць радасць дзецям і дарослым, дзяліцца цеплынёй свайго сэрца, адкрываць новыя грані чалавечага жыцця, у займальнай гульнявой форме тлумачыць іх сутнасць. Кніга Таццяны Сучковай «Сонечная карусель» (Мінск, «Каўчэг», 2022) выдадзена ў аўтарскай рэдакцыі, на беларускай мове. У хуткім часе новае выданне для маленькіх чытачоў, іх бацькоў і настаўнікаў з'явіцца ў кніжных крамах і бібліятэках.

**Для даведкі.**

*Таццяна Аркадзьеўна Сучкова – дзіцячая пісьменніца, член СПБ. Піша на рускай і беларускай мовах. Творы друкуюцца ў абласных і рэспубліканскіх газетах і часопісах: «Гродзенская праўда», «Вясёлка», «Гаспадыня», «Пралеска», «Пачатковая школа», «Зорька», «Качели» і іншых. Таксама творы пісьменніцы можна сустрэць на старонках калектыўных зборнікаў: «Галасы», «Нябесны знак», «Славянские колокола», «На Нёманскай хвалі» і інш. Казкі і вершы перакладзены на польскую мову. Пісьменніца – дыпламант Гарадскога творчага конкурсу «Гэта мой горад» (2003), лаўрэат Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Лепшы твор 2008 года» ў намінацыі «Дзіцячая літаратура» за кнігу «Тёплый дождик», лаўрэат Прэміі Гродзенскага аблвыканкама імя А. І. Дубко за дасягненні ў галіне культуры і мастацтва (2009). Аўтар кніг: «Считалочки», «Тёплый дождик», «О госпоже Печали и Настиной улыбке», «Удивительные приключения макаронины Моти», «Ты куда бежишь, тропинка?», «Необычайные приключения на острове Плаксита». Творы Т. А. Сучковай змяшчаюцца ў школьных падручніках. У 2022 годзе пісьменніца стала лаўрэатам IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч) у намінацыі «Дзіцячая літаратура».*

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**